БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоўская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—рана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Менску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш петыту на 1-й стран. 1 руб.
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 36. Менск. Нядзеля 5 мая 1918 г. Год I

ХРЫСТОС УВАСКРОС!

Панядзелак 6, Аўторак 7 і Серду 8 мая газэта с прычыны сьвят ні будзе выходзіць.

На Вялікдзень.

рышлі анёлы да Айца-Бога,
азалі Богу: «Чалом, чалом!
ом з далёкай мы пуцьдарогі,—
ім з Беларусі хвалу нясом
Хрыстос ўваскрос!

зе людзі спалі—усе паўсталі
быццё на волі адбудаваць.
родным краі усе пачалі
тэі далю сабе каваць.
Хрыстос ўваскрос!

а ночы позьняй с самога рана
адбудаваньне ідзець без мер.
хлебаробы пайшлі ў
пашану,
ад імі зорка блішчыць цяпер.
Хрыстос ўваскрос!

азаў анёлам Гасподзь
Магутны:
Гэй, дайце ў звоны сярод
нябёс,
Што Беларускі народ пакутны
ўваскрос!..»
Хрыстос ўваскрос!

Ясакар.

Менск 5/v.

Па зямлю—на Усход.

Drang nach Osten.

Як мы гаварылі, нацыянальная імперыялістычная расійская ідэя перасувалася на Захад, там яна мела пункты для практыкі. Адным з аб'ектау расійскай палітыкі былі беларусы, на іх культурным развіцці гэта дрэнна адбівалося; рабілі з народу нейкаго духоунаго калеку

Ідэі ішлі на Захад, а матэрыяльныя сілы людзей сунуліся на Усход. (Drang nach Osten.)

У Сыбір выехало з Беларусі за 15 гадоу 640000 душ, выехалі зямляробы, шукаючыя вольнай зямлі.

Масса беларусау за апошнія годы купляла праз селянскі банк маенткі у пауночнай прамысловай Вялікаросіі, гдзе есьць і індустрыя і нікоторае многазямелле. Такія беларускія фэрмэрскія гаспадаркі (хутары) есьць у губэрнях Костромскай, Вологоцкай, Калужскай, Маскоускай і у вялікарускай часьці Смаленшчыны, каля Дарагабужа і т. д. Пунктуальнай статыстыкі німа. Па прыватных вядомасьцях знаем, што вельмі много есьць такіх «магілеускіх» людзей, як завуць іх вялікарусы. Яны жывуць багацей за сваіх суседзяу, каторыя тлумачуць гэта багацтва тым, што «магілеускія шыбко» зямлей займаюцца, т. е. маюць вышэйшую зямельную культуру. Цікава тое, што беларусы вельмі трывалае плямя у барацьбе за жыцце між другімі племенамі. Яны асымілірують літвіноу, а на мяжы с Польшчай, па апаведанню аднаго дзеяча, яны умеюць «хаурусам» выкупляць маенткі на мазурскай зямлі і абладжывацца там.

Такім чынам беларусы калевізіруюць Маскоушчыну, гэта калёнізацыя стала рабіцца у вялікім масштабе, здаецца, з 1905 года, калі селянскі банк і палітыка была хуторománская. Беларусы - уласьнікі легка згаджаліся вясьці фэрмэрскую гаспадарку. «Абшчыннцы»-вялікарусы цяжка згаджаюцца. Банк інакш, як для фэрмэрскай гаспадаркі зямлі ні прадавау. Апрыч таго з вялікаруса слабы гаспадар,—ен ходзіць на фабрыкі, на старану і заработкі, моцнай цягі да зямлі у яго німа. Нікаторыя вучоныя даводзяць, што вялікарусы маюць нікаторую часьць татарскай і угрофінскай крыві, і іншэ яны на палавіну вандруючы народ, дзеля гэтага цэлыя массы [illegible] поугода выежджаюць ва усе староны на заработкі, на розныя промыслы, даюць цэлую армію бадзяючых рамэсьленікау, гандляроу.

Прычыны якія гоняць беларусау на Усход і у Сыбір, гэта—малозямелле Вітэбшчыны, Магілеушчыны і часьці Меншчыны. Выехало у Сыбір:

з Магілеушчыны	233	т.	душ.
« Вітэбшчыны	160	«	«
« Меншчыны	100	«	«
« Смаленшчыны	69	«	«
« Віленшчыны	43	«	«
« Гродзеншчыны	30	«	«

Інтэнсіфікацыя сельскай гаспадаркі, добрае управленне краем, зямельная Эуропэйская рэформа, развіцце беларускай індустрыі дасьць работу тым людзям, каторыя цяпер ні знаходзяць гдзе падзець свае рабочыя сілы. Пераход да бурачно-цукровай гаспадаркі ужо патрэбуець на 40% больш рабочых рук па зямлі.

Хрыстос уваскрос!

Хрыстос ўваскрос!

Пане гаспадару! Другое тысячалецце канчаецца, як хрысьцяне на вясну кожнаго гадавога кругу вітаюць гэтымі двума славамі адзін аднаго.

На ўваскрашэнне адвечнай творчай прыроды, — кожнай вясною людзі ўспамінаюць Таго Вялікаго Вучыцеля спаміж рыбароў, каторы суліў нам бязпрэчную праўду і шчасьце на зямлі — «Любі бліжняго як самаго сябе!» А калі німа гэтай любові, тады горо і сьмерць пануюць у нас.

Пане гаспадару! Ад нас саміх належыць здабытак гэтаго шчасьця,—ад нашаго хацення. Але адно—любіць бліжняго можа толькі бліжні, роўны, а ні раб — нівольнік. А вось наш народ, быўшы некалькі соткаў гадоў памеж аппугамі Масквы і Варшавы, ні мог мець гэтаго сьветлаго шчасьця на зямлі... Быўшы у ніволі, наш народ ні мог ад шчыраго сэрца вітаць на Вялікдзень славамі: «Хрыстос ўваскрос!» У пана с парабкам ні можа быць любові. Тут толькі з адной стараны—дэспотызм, а з другой—пакора.

Пане гаспадару! Наш беларускі народ шчыра выполняў другі загад Хрыста: «Калі хто бье цябе у адну шчаку—падстаў яму і другую». Пад цяжкі бізун сваіх мацнейшых славянскіх братоў беларус падстаўляў твар, плечы і грудзі цэлыя соткі гадоў. Доўга ён цярпеў здзек. Ад яго хацелі адняць культуру, мову і ўсе традыцыйныя здабыткі душы, якія укараняліся тысячу гадоў. Жыўшы у такіх варунках, беларускі народ ні мог мець праўдзіваго сьвята.

Але вось наступіў час, калі гісторыя пачала падводзіць свае падрахункі і на арэну вялікіх перэацэнкаў выступіла і доля беларуса—многапакутніка. Аб нас загаварылі па ўсяму сьвету і зноў пачалі нас біць у чатэры кіі... Кожнаму с славянскіх суседзяў хочэцца рвануць ласы кавалак нашай зямлі...

Пане гаспадару! Мы ні дадзімося, мы павінны быць нізалежным, вольным народам і тады толькі,—як роўны з роўным,—беларускі народ скажа на увесь сьвет: «Хрыстос ўваскрос!».

З. Б.

Агульныя весткі.

КОРФУ. Сэрбскае бюро прэссы паказывае:

Пры галасаванні ваенных крэдытаў на 250 мільёнаў дінараў опозыцыя ў Скупшчыне пакінула салю і гэтак ні дапусьціла да галасавання.

НЬЮ-ЮРК. «Reuter». Б. нямецкі генэральны консул у С. Франціско, немец ф. Шак, б. нямецкі ваенны агент Норн і агент нямецкаго Льлёйду Капэль за спробы падняць у Індзіі паўстанне проці прыязнаго Амэрыцы англіцкаго ураду засуджэны кожны на 2 гады ў вастрог і на 10.000 доляраў штрафу.

ЛОНДОН. «Reuter». С Пецярбурга паказываюць, што расійскі марскі афіцэр, барон Мірбах, назначэн марскім аташэ ў Бэрліне.

ЦЮРЫХ. Згодна с пастауленым заданнем расійскі камісар заграничных спраў Чычэрын загадае устрымлівацца ад уселякай агітацыі проці гасударственых установ цэнтральных дзержаў.

БЭРЛІН. Урадова. У заходняй часьці Сяродземнаго мора нямецкія падводныя лодкі затапілі зноў 26.000 тонн.

БЭРЛІН. Англіцкія газэты жаляцца на ніпраўдзівасьць англіцкіх урадовых вестак аб стратах ад падводнай вайны. «Times» кажа: Нестачу караблёў кожын з нас адчувае кожын дзень і кожную гадзіну. Сьвядомые людзі пераконаны, што кожная адцяжка суліць катастрофальныя пасьледзтвы. Нідалёка той момэнт, калі нашы чыгункі акажуцца ў крытычным палажэнні. Гэтак нестача караблёў значна аслабляе ваенную моц саюзнікаў.

БАЗЭЛЬ. «Havas». Англі-

чане прыгатаўляюць новыя пазыцыі у 2 кілёмэтрах перад Іпрам. Немцы без перадышкі востра абстрэльваюць тамтэйшыя францускія цазыцыі.

ЛОНДОН. «Reuter». Загадам караля завядзеннe ваеннай павіннасьці ў Ірляндзіі адкладываецца. Урад пастанавіў перш правясьці праз парлямэнт закон аб самаупраўленні Ірляндзіі.

ПАРЫЖ. «Havas» 1 гм Нямецкая дальнабойная гармата ўчора далей абстрэлівала ваколіцы Парыжа.

Пуанкарэ і гэнэрал-губэрнатар Парыжа аглядалі шкоды ад апошняго абстрэлу.

ЖЭНЭВА «Humanité» кажэ, што пры першай удачы саюзнікаў супроць нямецкаго наступлення на Калэ трэба ўраз жэ пачаць мірныя перагаворы—нават і ў такім прыпадку, калі варункі міру ні зусім здаволяць Францыю.

БЭРЛІН. Статс - сэкрэтар стрававання заявіў у Рэйстагу што дакляраваныя Украінай 60 мільёнаў пудоў ... жжа павінны быць здадзены цэнтральным дзержавам да 31 ліпня. С прычыны відахваткі корму для скаціны прышлося назначыць для убою вялікае число сьвіней і рагатай скаціны. Калі ні ўдасца прывезьці з Украіны 15.000 галоў рагатай скаціны, дык прыдзецца паменшыць порцыі мяса. Ні гледзячы на ўсе труднасьці, можна напэўна сказаць што нават пры мерным ураджаі мы дзякуючы падвозу з Украіны, забаспечым сабе справу і на будучыну.

ГААГА. Голандскае міністэрство загранічных спраў апавешчае, што англійскае адміралцейство залажыло пояс мін у Нямецкім моры ажно да самых астравоў Оркнэй. Гэта ішчэ больш робіць трудным рух голандзкіх тарговых судзен, ды нават робіць яго зусім німагчымым.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Почта, як аказавыецца. ім... ч... ні можа пачаць так хут... сваіх функцыяу, дзеля шма... розных прычын.

Ліквідацыя Земсаюза ідзець чэрапашым крокам, як бы «ліквідацыйнае упрауленне меннямі б. У. З. С.» наумысьне зацягівае сваю працу.

Што-ж, паном ліквідатарам пэнсыя выплачываецца акуратна ад Губ. Земства, а што датычыцца соткау служачых і рабочых, якія ад 1-го марца чэкаюць выплаты грошай, то гэта мала каго цікавіць. Чужая болька людзям—сьмех!

Замест уволенаго кс. Міхалькевіча на пост упрауляючаго Р.-К. епархіей выстауляюцца дзьве кандыдатуры: а) бышы інспэктар пецярбурскай р. к. духоунай акадэміі кс. Матулевіч і б) цяперашні рэктар віленскай р.-к. дух. сэмінарыі кс. Ушылло.

Сярод служачых і рабочых ст. Менск Александраускай ж. д. зроблена анкета, дзеля высьнення ліку служачых пасьля ад'езда шмат з іх у Маскву у у Раду Народных Камісароу па „дэкрэцкія прыбаукі."

Пасьля анкецкіх падрахункау, па загаду нямецкай улады, будзе дапауняцца нідахват камплекта служачых, глаунае сярод ніжэйшаго пэрсонала—стрэлачнікау, качэгарау, вартаунікоу і др.

У мешчанскай управе заправілы яе вядуць старанно агітацыю сярод пяцідворных дэпутатау дзеля іх будучаго на вялікдзень агульнаго сабрання с прычын ліквідацыі спрау мешчанскай управы перад далучэннем іх да местоваго самаупраулення. Агітацыя вядзецца у духу падняцця настрою, што усе мешчанскія справы, на працягу дзесяцілеццяу, вяліся чыста і гладка.

У местовай управе, с прычын вялікадня заняцце для праваслауных спынено з 3 го па 8-е мая. Каталікі у Вялікую суботу працавалі. Пэнсыю за красавік, с прычын упраускіх грошавых сухот, ні заплацілі. Гэтак перад Вялікаднем! Аб сабе то пауне ні забыліся паны з Тулы.

Той самы крызыс і у Губ. Земстві, дзе па зьменшанні штату у стагыстычным бюро пачынаюць сэрьезна думаць аб урэзках у Страховом аддзелі.

Грандыезная па ліку польская нацыянальная працэсія с прычын гадоушчыны польскай канстытуцыі на чале з усім тутэйшым р.-к. духавенствам адбылася у пятніцу 3-го мая.

Працэсія ішла з золатогорскаго касьцела па гораду у кальварыйскі касьцел,

Выбары у еурэйскую абшчыну адбудуцца ва усіх 5-ці часьцях горада сягоння, заутра і 7 мая,

Скарбонaчны збор упраускай камісыяй па арганізацыі «нядзелі прызрэння» адбудзецца 7-го і 8-го мая.

Весткі с краю.

З Вільні.

Беларускі Цэнтральны Саюз Нацыянальных Грамадзкіх Організацый стварыў выдавецкі фундуш дзеля школьных кніжэк у беларускай мове.

Першае выданне яго—гэта «Новы Лемэнтар» Янкі Станкевіча. Лемэнтар гэты выйшоў ўжо у другім выданні.

Намечэн выпуск некалькіх іншых кніжэк, найбольш патрэбных дзеля школ.

С Смаленску.

Падаем цікавыя выпіскі аб Смаленскім жыцці с прыватнаго лісту ад 28 красавіка г. г.:

«У Смаленску спакойна. Быў 2-гі з'езду саветаў абласьці, па якім кіравалі «мінчане» (Мясьнікоў, Крывашэін, Рэзавускі і др.). Прымусова злучылі Смаленшчыну з другой нізабранай часткай нашаго краю, тлумачучы патрэбу гэтаго толькі адным, што будзе лепшы спосаб дастаць ад Цэнтр Улады саветаў грошы і рабіць самастойныя закупкі хлеба. Баяліся і сьцерагліся ужыць слова «Беларусы» і толькі адзін дэлегат пачынаў гаварыць, дык яго ні слухалі і перабівалі. Цяпер ідзець вострае змаганне паміж Обликкамзап»-ам і Смаленскім «Губсполком»-ам. Апошні ні хоча быць скасаваным і кажа, што чужыя людзі ні маюць як ні мелі, права тут нешта рабіць, ні спытаўшы аб гэтум правамоцнато з'езду Смаленшчыны. Есьць безработице. Дарагоўля як раней. На гэтым грунці было трохі ніспакою, але весткі у Менскіх газэтах занадта павялічаны.

...Сюды прыежджае шмат вялікарусаў і беларусаў з Украіны. Усе іх дакумэнты напісаны па украінску, што тутэйшым рэзць нос. Соцыялізацыі і паддзелу зямлі пакуль што німа, хаця Няпро ужо спадае, цьвітуць вербалоз і пралескі У Смаленску ніофіцыяльна забаронено прадаваць маскоўскія «буржуазныя» газэты; можна даставаць у хлопчыкаў с пад-палы за 3 руб. «Смоленскій Вѣстникъ» «мінчане», як прыехалі зачынілі. Цяпер тут і «Извѣстія» совдеп., «Звезда» і «Слово Анархіста», апошні № якога сканфіскавалі. У «Извѣстіяхъ» друкавалося некольки апавяданняў с пад'аглаўкам «с бѣлорусскаго». Цяпер паволі да гэтаго слова прызвычаіваюцца тут усе, апрача Латыша Кнорына, рэдактара «Звезды», каторая як помніцца цьвярдзіла выходзячы у Менску, што беларусы на Беларусі меньшасьць. Тутэйшыя газэты пісалі перш бытцам Раду у Менску разагналі, потым пішуць—у яе састаў ўвайшла «буржуазная» група і вельмі крычаць аб том гвалту Тутака быў уложаны маленькі руска-беларускі слоўнічак, але выдаць яго у Смаленску ні удалося — выдасьць мабыць Бел. Нац. Комісырыят у Маскве».

Далей у лісьці ёсьць вестка, што паэт Я. Купала і пісьменнік М. Горэцкі жывуць так сама цяпер у Смаленску.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоуна... камандавання за 4 мая 1918 року.

З А Х А Д: Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта і ... мецкаго Кронпрынца.

На баевых фронтах палажэнне ні зьмянілося. Арты... рыйская дзейнасьць была рухавою нават ў начэ. У вако... цы Кеммеля і па абодвых бакох Аўры яна дасягнула ... датнаі моцы. Ангельская атака на поўдня-захад ад Ар... су была адбіта.

Група арміяу Гальвіца.

Перад Вердэнам артылерыйская дзейнасьць ажывіла...

Група арміяу Гэрцога Альбрэхта.

Пасьля ніўдачных нападаў ніпрыяцельскіх разьведч... каў, на Лётарынгском фронці, баевая дзейнасьць аслабе... Узнавіўшыйся па абедзі артылерыйскі бой каля Парройс... го лесу і заходней Бламону аслабеў в надходам цемнаты.

Мы зьбілі ўчора 25 ніпрыяцельскіх аэроплянаў і ... прывязных балёны. Лейтэнант Букклер здабыў сваю 33, ... Лейтэнант Бюттэр сваю 22-ю паветраную перамогу.

У С Х О Д. Фінляндзія: Паўднёва-заходняя част... Фінляндзіі вызвалена ад ніпрыяцеля. Нямецкае войско ... еднасьці с фінляндскімі батальёнамі атакавалі ніпрыяце... між Лаці і Таваcтгусам, акружыўшы яго, і разьбілі яго ... пяцідзеннай бітві, ні глядзючы на заўзятую праціўнасьць ... адважныя спробы прарвацца. Фінляндзкае войско адрэза... яму дарогу на поўнач. Абкружаны зусіх бакоў ніпрыяце... пасьля цяжкіх крывавых стратаў, павінен быў скласьці збро... Мы ўзялі 20000 палонных, 50 гарматаў, 200 кулямётаў ... тысячы коней і возоў.

Перпы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Рэдактар А. Прушынскі.

Выдавецтво Т-во «Заранка».

Друкарня Я. А. Грынблята.